# Покатигорошек

Був собі чоловік да жінка, а у них було два сина і дочка. От батько посилае синів орать; вони кажуть: «А хто нам обідать принесе?» Батько каже: «Дівка». А дівка каже: «Я дороги не знаю». От брати кажуть: «Як зійдеш на гору, так буде три дороги; на которій дорозі стружки будут лежать, то ти по тій і йди». Змій бачить, що два брата їдуть і все по дорозі стружки стружуть; він узяв стружки, позбирав, да кида по тій дорозі, що до його нори. Мати наварила обідать і дала дочці нести. Вона вийшла на гору і пішла по тій дорозі, по которій стружки лежать; дійшла до нори, а змій узяв її да в нору і кинув.

Брати ждали-ждали обіду да й випрягли воли; воли пустили пасти, а сами пішли додому да й питають матери: «Де ж ваш, мамо, обід?» Мати каже: «Я ж давно вам з дівкою послала». От вони до самого вечора її ждали: уранці вcraлі — її нема! Брати кажуть: «Мабуть її той проклятущий змій узяв!» Вони одяглись да й пішли сестри шукать. Ідуть да ідуть — коли чередник череду пасе. Вони поздоровались; чередник питає: «Куди ви ідете?» Вони кажуть: «До змія — сестри одіймати» — «Як хочете ви однять од змія сестру, то із’їжте у мене самого більшого вола». Вони не захотіли да й пішли. Ідуть да ідуть — коли пастух пасе овечки. Вони із ним поздоровались. Він їх питає: «Куди ві ідете?» — «До змія — сестри одіймать» — «Коли хочете її однять, то із’їжте у мене самого більшого барана». Вони не захотіли да й пішли.

Ідуть да ідуть — коли свинар пасе свині. Вони поздоровались. Він їх питає: «Куди вы ідете?» — «До змія — сестри одіймать». — «Коли хочете її однять, то із’їжте у мене самого більшого кабана». Вони не захотіли да й пішли. Ідуть да ідуть — аж змій стоїть коло свого дому. Змій каже: «Здрастуйте! Чого вас сюди бог заніс?» — «До тебе за сестрою». — «Коли хочете свою сестру узять, так із’їжте дванадцять волів, дванадцять баранів і дванадцять кабанів». Вони по малесенькому кусочку із’їли да й більше не захотіли. Він їх узяв да під камень підвернув.

Мати плакала, що нема ні синів, ні дочки; узяла відра да й пішла по воду до колодязя, набрала води да іде — коли горошина котиться по дорозі да й вскочила у відро, а вона і не бачила. Прийшла додому, виливає воду — коли дивиться: горошина у відрі; вона узяла да й із’їла, і од тієї горошини уродився син. Дали йому ім’я Покотигорошко; він росте не по часам, а по минутам. Посідали вечеряти, Покотигорошко питає: «Чи у вас, мамо, були іще діти?» — «Було у мене двоє синів і одна дочка». — «А де ж вони?» — «Змій украв дочку, так сини пішли її шукать; да нема ні синів, ні дочки».

Він повечеряв, обувся і одівся. «Піду ж і я тепер за ними». Просить коваля: «Ізроби мені велику булаву». Коваль ізробив йому булаву; Покотигорошко узяв булаву, заплатив да й пішов. Іде да іде — коли пасе чередник череду. Він із ним поздоровались; чередник його питає: «Куди ти ідеш?» — «Іду до змія — сестри одіймать». — «Із'їж у мене самого більшого вола, так одіймеш!» Він із'їв, подякував да и пішов. Іде да іде — коли пастух пасе овечки. Покотигорошко із ним поздоровались; пастух його питає: «Куди ти ідеш?» Він каже: «До змія — сестри одіймать». — «Із'їж у мене самого більшого барана, так одіймеш!» Він із'їв, подякував да й пішов. Іде да іде — коли свинар пасе свині. Покотигорошко із ним поздоровались; свинар його питає: «Куди ти ідеш?» — «До змія — сестри одіймать». — «Із'їж у мене самого більшого кабана, так одіймеш!» Він из'їв, подякував да й пішов.

Іде да іде — аж стоїть дом змія, і сестра бере коло колодязя воду: «Здрастуй, сестра!» — каже Покотигорошко. Вона йому: «Який ти мені брат?» Він каже: «Побачиш, який я тобі брат!» От виходить змій: «А, здрастуй!» — каже. «Здрастуй!» Змій його питає: «Чого ты прийшов?» — «За сестрою да за браттями». — «Із'їж дванадцять волів, дванадцять баранів і дванадцять кабанів». Він узяв, всі поїв. Змій каже: «Молодец! Ну, тепер чи будем биться, чи мириться?» — «Будем биться! Я з тобою не хочу мириться». — «Дми ток», — каже змій. «Дми ти, — каже Покотигорошко, — бо ти в своїм добрі хазяїн, а не я». От змій як дунув — ток у його став чавунний; а Покотигорошко як дунув — ток у його став мідний. От Покотигорошко як дав змію булавою, так змій став по коліна в землі; ударив другий раз — і убив змія. Тоді узяв змія, посік-порубав, на попіл перевіяв; братів з-під каменя ізвернув, забрав їх і сестру да й пішов додому. Батько і мати були раді!

134

Неўкаторам царстве і неўкаторам гасударстве, на моры-акіяні, на остраве на Буяні, стаіць дуб зелёны, а пад дубам бык печоны, і ў яго баку нож точоны: сейчас ножык добываецца — ізволь кушаць! I то яшчэ ні казка, толькі прыказка; а хто маю казку будзе слухаць, так таму собаль, і куніца, і прыкрасная дзевіца, сто рублёў на свадзьбу, а пяцьдзесят на прагулянье.

Быў сабе мужык і быў ў яго салам'яны язык(?), і меў ён два сына і адну дочь, хоця яка стану простага, але неопісанной красоты. Айцец і маць былі дастаточны; паработалі яны свае хлебопашество сваім парадком во времені, і іх айцец гаворыць сынам: «Дзеці! Не нада спадзевацца на гэта, што есць, ні спадзевацца на гэта, што зроблена, а нада шчэ прызапасіцца: пущай будзе!»

Адпраўляюцца яны ў чужое панство на хлебопашество і бяруць хлеба на тры дні. «Кагда вы тот хлеб з’ядзіце, вам сястра прынясець больш». А ім было ідці так, як бы цераз Горадзілоўскі лес. Сястра і гаворыць ім, што я не буду знаць, куда несці вам есці. Старшы брат гаворыць: «Мы будзем для цябе дарогу адзначаць, будзем салому трусіць, — па гэтай дарозе просто к нам прыдзеш». І яны пашлі і дарогу адзначылі; а ў том лесе быў глаўны змей і тые разгаворы слыхаў и переслаў дарогу ў свой дварец.

Як вышло тры дні, адпраўляецца яна к ным з абедом; пашла яна і прыходзіць просто ў змеіны дварец, пацерала пуць-дарогу і гаворыць: «Куды я зайшла?» Выходзіць к ёй сямігаловай змей і гаворыць: «Пайдзі, пайдзі сюда, умница! Я цябе даўно дажыдаў, я до цябе даўно дабіраўся; ну як ты харошага айца і мацяры, яны цябе трымалі пад бальшым надзором, і я не мог до цябе дабіцца. Я бы не сматреў, што ты простага роду, я бы табою не брезгаваў, даўно была бы мая… а уж цяпер іменно мая! Забывай айца і маць, бо ты уже іх відзець не будзеш; а ў мяне будзеш ты ўсем давольна».

Брацця яё пахали тры дні, і не стало ім піщы; яны бросілі пахаць і прыходзяць дамой і з вяликаю гразою к айцу і мацяры: «Адчаго вы не прыслалі піщы?» Айцец гаворыць, што вам сястра панесла такого-то дні. Яны гаворацъ к айцу: «Кагда ёй ужо няма, то і не будзе!» — «Я пайду, — сказаў адзін, — сваю сястру шукаць; хоць жызнь сваю палажу, а пайду шукаць». Айцец гаворыць: «Не йдзі, сынок, бо сваю жызнь кончыш, а ёй ужо не увідзіш». А ён гаворыць: «Пайду!» І прыходзіць ён к гэтаму самаму змею і відзіць яну на дварэ. Яна яму гаворыць: «Зачім ты сюда прышоў? Ты сваю галаву паложыш. Я цяпер няшчасная, я цяпер не твая сястра, а ты не мой брат! Папалася я ў катаржны рукі». Брат гаворыць: «Пущай же я здзесь пагібну, абы я на цябе насматреўся». Яна яму гаворыць: «Пастой ты здзесь; а я пайду спрашу, што ён скажэ, што ты прышоў ў госці».

Прыходзіць яна к змею ў спальню: «Што бы ты, душенька, дзелаў, каб мой старшы брат ў госці прышоў?» Ён гаворыць: «За госця прыняў бы». Яна вышла і уводзіць яго ў горніцу; он устаёць із койкі сваей і зачаў годоваць яго, як добрый чалавек. «Ступай, жонка, прынясі жалезного бобу і жалезного хлеба… Ну, кушай, швагер!» Узяў яму урезаў хлеба; ён узяў хлеба і зёрнушко бобу, падзяржаў і палажыў. Змей гаворыць: «Верно ты, швагер, сыт, бо ты гардзыш маім хлебом і солью. Пайдзем же цяпер пасмотрым: ці ты багачэ, ці я?»

І павёў яго па ўсем харомам, і есць у яго ўсякого добра відімо і невідімо! Павёў яго ў конюшню к лошадзям, і стоіць у яго дванаццаць жарабцоў, і ўсякой жарабец на дванаццаць цяпоў прыкован. «Ну что, швагер, ты багачэ ілі я?» Ён яму атвечаець: «У мяне того трэцяй долі няма, што ў швагра». — «Ну, пайдзі

же за мною; я цябе пакажу штуку». І прыводзіць яго к калодзі — чатыры сажні талщыны, а дванаццаць дліны. «Ці відзіш ты, швагре, тую калоду?» Ён яму гаворыць: «Віджу». — «Еслі ты яну без тапара парубаеш, а без агню спаліш, так пайдзеш дамой». А ён гаворыць: «Хоць сейчас ты мяне парубі, а я гэтаго не зраблю». — «Кагда ж ты гэтаго не здзелаеш, полно цябе сюда хадзіць дураку-мужыку, салам’яному языку; а ты за мною пабратаўся! Калі ты мне брат, то і свыня сястра! Ты не толькі за мною рэчі гаворыць, не доўжен на мяне глазом пасматрець; бо ты не достоін сюда хадзіць і мой дом пакасціць!» І ўбіў яго і глазы выняў, ўложыў ў чарапок, а яго ўзяў за воласы і павесіў на бельцы.

Цяпер і другой брат тоже пашоў шукаць сваей сястры і нашоў яну на дварэ ў змея. Яна яму гаворыць: «Ах, брат! Уб’ёць ён і цябе так, як першаго». — «Пущай уб’ёць, абы я з табою відзеўся!» — «Пастой же тут; я пайду запытаюся, што ён скажэ?» І прыходзіць яна к змею ў спальню. Ён устаёць із сваей койкі: «Што скажэшь, жонка? Віжу я твой усердный від і пакорнае ліцо». — «Ах, мілый мой муж! Што бы ты рабіў, каб втарой мой брат ў госці прышоў?» — «Што б я рабіў? За госця прыняў бы». Яна гаворыць: «Можэ прынялі б яго так, як першага?» — «Я першаго ўбіў, бо ён за мною грубіў, не ўмеў за мною честно абхадзіцца. Пущай прыходзіць, гэтаго я прыму»,

Яна выходзіць на двор і гаворыць брату: «Пакорно абхадзісь!» — «Давай, жонка, — гаворыць змей, — жалезного бобу і жалезного хлеба». Яна прыносіць поўхлеба і чашку бобу. «Бо старшы твой брат недаволен быў, то можэ мало было; возьмі гэта, а прынесі больш». А госць і ў рукі не ўзяў, гаворыць: «Пакорнейше благадару, швагер, бо я есць не хачу». — «Пайдзем же мы, швагре, пасмотрым на маё багацтва: ці ты багачэ, ці я?» І павёў яго по ўсем сваім харомам, і відзіць ён, што змей багат, багат незлічымо! Прыводзіць яго змей ў сваю багатырскую канюшню: стаіць дванаццаць жаробцоў, і каждая лошадзь на дванаццаць цяпоў прыкована. Ён гаворыць змею, што у мяне трэцяй долі таго няма. «Ну, пайдзі ж, я табе пакажу штуку!» І паказаў яму калоду чатыры сажені талщыны, а дванаццаць дліны, і гаворыць: «Відзішь ты тую калоду? Еслі ты без тапара яну парубаеш, без агня спаліш, то пайдзеш дадому, а не то — будзеш вісець з братом». Швагер яму сказаў: «Хоць сейчас убій, а не зраблю гэтага!» Тада змей яго убіў, вмесця воласы звязаў і цераз бельку перакінуў.

Прыходзіць ён у сваі палаты і відзіць жонку ў бальшой таске і ў жалобе. «Ах, мужу ты мой, мужу, што ты мне зрабіў? Братоў ўбіў; я не маю больше ні роду, ні племені, толькі айца і маць. Предай і мяне злой смерці, пущай не буду жыць!» — «Нет, мілая! Я табе таго не здзелаю; а калі б дастаў айця і маць, то і

іх ўбіў бы: то б ты ні об ком не думала і весельшая была б! Пущай же яны живуць і клоццяжуюць, а мы хлеб, бо ў іх нет».

Пашла матка по ваду; ўзяўшы ведра і набраўшы вады, ідзець дадому і вельмі плачэ, і думаець яна сабе усерднымі думкамі: «Ах, боже мой! Чаго я цяпер даждалася на старасці». Ўзяў господь яё усердное ўздыханіе, і ўдруг відзіць яна: каціцца гароховае зёрнушко. Яна думаець сабе: «Гэта дар божый!» Узяла яго і з'ела. З гэтаго зёрнушка ўдруг завязаўся ў яё рабёнак, і, вынасіўшы свае время, дажідаець, што доўжен ён нарадзіцца на сей свет. Вот палягли спаць, і ў самое паўночнае время на ўтіхоміры гласіць у яё брюхе чалавечаскім голасам: «Не сподзевайсе мяне, маманька, ў скорае время, бо я защытнік буду вам і добрым людзям». Панасіла яго шчэ несколькі врэмені, і раждаецца ён на сей свет і расцёць не па гадам, а па часам, як пшоннае цесто на дрожджах: і пестуюцца и цэлуюцца з ім, як не нада лучше, і даюць яго ў школу: каторые учылісе гадов по тры-чатыры, а ён узнаў ў адзін год, і не стало яму граматы. Прыходзіць ён з учыліща к айцу і мацярі: «Ну, татанька і маманька, благатворыце маіх учытелей, бо уж мне хадзіць в учыліще поўно. Я, благадара бога, знаю больше іх. І прошу вас з усем усердіем сказаць мне праўду: какой я у вас есць? Чы я раждзён первый, чы паследній?» Яны гаворать: «Ах, сыну наш мілы, ты ў нас паследній», — і сказали яму па істіннай праўдзе, што ў яго было два брата і сястра. «А гдзе ж яны дзеліся? Калі памерлі, то я не супратіўнік богу, а калі што зрабілосе от худых людзей, то я магу ўзыскаць». Яны яму гаворать: «Ах, сыну наш мілы! Як же ты уйдзеш і нас пры старасці, древніх людзей, бросіш? Хто нас да смерці даховаець?» Ён ім гаворыць: «Чый вы прежде ели хлеб, той вас будзе хараніць! Бо мяне вы не ўдзержыце, мяне людзі даўно ждуць. Ну, маманька і татанька, лажымся спаць: утро мудрэней вечара; дасць бог дзень, дасць бог і піщу».

Поўтру ён устаў, ўмыўся і богу памаліўся і на ўсе чатыры стораны пакланіўся. «Пазвольце, — баіць, — мне перад паходам пагуляць». Ну, пашоў сабе на ўлицу гуляць, і находзіць ён шпільку, і прыносіць к айцу і мацяры. Гаворыць ён айцу: «На цябе гэта жалезо, несі до каваля і здзелай мне булаву сяміпудаву». Айцец яму славесно не гаворыць, а толькі ў думке думаець: «Даў мне господь дзеціще не так, як людзям; я ж давёў яго да средственнаго разуму, а ён цяпер із мяне кпіць!» Можэць лі то быці, штобы з шпількі была булава сяміпудава». Айцец, імеўшы бальшую сумму — залатую, сярэбраную и бумажную манету, паехаў ў горад, купіў жалеза сем пудоў и даў кавалю дзелаць булаву. Здзелалі яму булаву сяміпудаву і прывозяць дадому. Пакацігарошак выходзіць з горніцы, бяроць сваю булаву сяміпудаву, і слышыць нябесны штурм, і пущаець яну за аблакі. І прыходзіць ён ў сваю горніцу: «Матка, на ў мяне ў галаве паіщы перад паходам, а то мяне бруд заесць, бо я млад юноша…»

Вод, ўстаўшы із маткіных кален, выходзіць ён на двор і відзіць нябесны тучы. Упаў ён да сырой зямлі правым ухам і, ўстаўшы, клічець свайго айца: «Бацька, падзі сюды, сматры, што шуме і гудзе, мая булава да землі ідзе». Паставіў ён калено проціў сваей булавы; ударыла яго булава па калені і пераламалася папалам. Ён рассердіўся на свайго айца: «Ну, айцец, адчаго ты мне не здзелаў булавы з гэтаго жалеза, што я табе даў; а калі б ты здзелаў, то яна не сламілась бы, толькі сагнулась бы! На ж табе гэта самае жалезо, ступай дзелай; свайго не прыкладай». Кавалі ўкінулі жалезо ў агонь і зачалі малатамі біць і цянуць і здзелалі булаву сяміпудаву; шчэ асталася.

Бяроць Пакацігарошак сваю булаву сяміпудаву і атпраўляецца ў пуць, ў чыстую дарогу, і прыходзіць ён к гэтаму самаму змею сямігаловаму, гдзе находзяцца яго браты і сястра. Выходзіць яна к яму наўстрэчу: ён з ней здароўкаецца і гаворыць: «Здрастуй, мілая і радная сястра!» Яна атвечаець: «Какой ты мне брат!» І ён падаець ей айца і мацяры рукапісаніе, што ён есць радной яё брат. «Пастой же ты, брацід, здзесь, а я пайду спрашу, што змей на ответ скажэ». Пыходзіць яна ў яго багатырскаю спальню; змей у ёй спрашываець: «Ах, жонка, ты да мяне не з вясёлым відом ідзеш!» — «Я прышла до цябе, мой мужу, што мой самый меньшый брат прышоў ў госці». — «Аж у цябе не было больше братоў, як толькі два». — «Ён раждзён без мяне».

Зараз змей ўстаёць і бяроць валшэбніцкую кнігу, смотрыць і мовіць да жаны: «Ну, жонка, шчэ будзе ў цябе брат!.. Калі ён безвременно ўродзуўсе, я з ім разгаварываць мало буду, ступай, прызаві яго». Пакацігарошак ўходзіць да яго ў комнату: «Здрастуй, швагер!» — «Але ты шчэ млад, бо ў цябе мацярыно малако на губах не засохло! Калі б цябе мацьвынасіла (шчэ) дзевяць дзён, дзевяць часоў і дзевяць мінут, то б ты мой супратіўнік быў; але пагасті...» І становіць яму жалезнае крэсла. Як ён на крэсле сеў, крэсла і трэснуло. «А што, швагер, ў лясу жывёш, а ў цябе крэсла худые; ай лі нет ў цябе плотникаў харошых, штоб крэсла здзелалі пакрепчэ?» Змей думаець сабе: «Верно я папаўся ў добрые клешчы!.. Ну, давай, жана, нам напітков і наедков».

Прыносіць яна решато жалезного бобу і жалезного хлеба. «Ізволь кушаць, швагер!» — «Благадару, швагер! — гаворыць Пакацігарошак. — Я без ўсякой прозьбы буду кушаць, так як у свайго, бо з паходу я есці хачу». І стаў есць умесці з ім; тот з’есць хлеба кусок, а гэтот з’есць два. «Даволен лі ты, швагер, у мяне?» — «Даволен, не даволен — калі больше няма!» — «Ну, пайдзём, швагер, пасмотрым на мае багацтво: ці ты багачэ, ці я?» І павёў яго по ўсём сваём добре. «Як табе здаецца: у цябе большэ ілі ў мяне?» — «Я не багат, але і ў цябе няма нічаго!» Ён гаворыць: «Ты, швагре, за мною грубыш!.. Ну пайдзі же, я табе пакажу штуку».

І прыводзіць яго к гэтай самай калодзе, куда і братоў прыводзіў, каторая чатыры сажні талщыны, а дванаццать сажон дліны. «Кагда ты яну без тапара парубаеш, а без агню спаліш, так пайдзёш дамой, а не так — будзеш там, гдзе і браты!» — «Не сердзісь, дай мне дзело кончыць!» — сказаў Пакацігарошак і ўзяў мізінным пальцом таркануў сію калоду, так яна ў мелкіе друзгі паляцела, а як дмухнуў — попел стаў, аж не было! «Ну што? Я сваё дзело споўніў!» — «Пайдзём цяпер пaборымся: ці ты сільнее, ці я?» Пакацігарошак гаворыць яму: «Дай руку, я падзержу, — папробуемсе так: хто сільнее!» А змей гаворыць: «Гдзе табе, малакасосу, за руку мяне браць!» Ён кажэ: «Усё едінственно нам пабіцца». — «Ну, — гаворыць змей, — на табе руку». І схваціліce яны за рукі і як здавілі дружка дружку, Пакацігарошкава рука толькі пасінела, а змеіная рука за всемі пальцамі асталася у Пакацігарошка. «Адначе я тым не даволен», — гаворыць змей, і як дмухнуў — зрабіў медны ток. А Пакацігарошак як дмухнуў — зрабіў сярэбраны ток.

І схваціліce яны бароцца. Як дмухнуў змей — ўбіў Пакацігарошка ў сярэбраны ток, а Пакацігарошак як дмухнуў — ўбіў змея ў медны ток адразу па калена. Змей як дмухнуў другой раз — ўбіў Пакацігарошка па калена, а Пакацігарошак як дмухнуў другой раз — так ўбіў змея па пояс. Змей гаворыць: «Пастой, швагер, аддыхнём!» — «Шчэ ні очень патамілісь, — каже Пакацігарошак, — я з паходу, да і то не ўмарыўся». Змей да яго гаворыць: «Відно, швагер, я ў цябе пагіб!» Пакацігарошак кажэ: «Бо я за тым прышоў». — «Астаў мне сколькі-нябуць жызні, — просіць яго змей, — і бяpi сабе залатаю, сярэбраную і бамажную маю казна, сколькі угодна». — «Я бы аставіў табе жызні на сколькі-нябуць, але ты мяне для першага случаю абезчесціў, назваў малакасосам: то мне очень цяжало знясці. Нет табе пращенія! Больш з табою і гаворыць не хачу». Змей, ўпаўшы ў вяліку злобу, распусціў сваю кроў па ўсем сваім жылам, даў прастор сваім рыцівым плячам і ўдарыў Пакацігарошка і ўбіў яго па пояс. «Ну што, нацешыўся, швагер?» — гаворыць Пакацігарошак. — «Да поўно мне з табою шуткі шуціць! Бо я дурак перад табою, доўго балую; даўно бы нада цябе прыбраць». Як ударыў яго Пакацігарошак трэцій раз, ўбіў яго па самаю шыю ў медны ток і бяроць ён сваю булаву сяміпудаву і кончыў яму жызнь да, ўзяўшы змея, замазаў яго завсем ў медны ток.

І пашоў Пакацігарошак у багатырскаю канюшню, гдзе стаялі багатырскіе жарабцы; ўзяўшы перваго жарабца за хвост, ён здернуў із яго тулуном шкуру, выпатрашыў яго і сам у гэтае тулобіще ўлез. Прылятая крук з кручанятамі і началі есць, ён адно кручаня і злавіў за нагу, і гэты воран стаў чалавечаскім голасам гаворыць: «Хто ў том тулобіще есць — акажысь!» — «Я, Пакацігарошак». Крук яму гаворыць: «Што ты ад мяне жалаеш?» — «Што я ад

цябе жалаю? Прыстаў мне цялющай і жывущай вады, а калі не даставіш, то сколькі вас есць — усе пагібніце».

Тагда крук, узяўшы пузыркі, паляцеў за трыдзевяць зямель у дзесятае царство, іншае гасударство, і дастаў вады з-под вялікай стражы і прыносіць Пакацігарошку. Палучыўшы сію ваду, Пакацігарошак для вернасці ўзяў яго дзіця за обе нагі і разарваў папалам. «Я цяпер уemployees, ці верная то вада?» Ён адною вадою памачыў, стало кручаня цело, а другою памачыў, і кручаня аджыло; стаў благадарыць і пусціў яму дзіця. Цяпер ён прыходзіць к сваім братам і ўзяў памачыў іх цялющаю вадою, і сталі яны целы, а другою памачыў — сталі жывы. І прыводзіць ён іх да сястры. «Ну, сястра і брацці, бярыте залатую, сярэбраную і бумажную казну, сколькі вам угодна, і несіце дадому». І пашлі яны ўсе ўчатвяром.

Вод браты, войшоўшы ў лес, і прывязалі Пакацігарошка к дубу. «Брацці, што вы робіце нада мною?» — «Какой ты нам брат? У нас брата не было і не будзе». Ён, адпусціўшы іх ад сабе на небальшое расстаянье і ўзяўшы сабе велікое злобіе, выкруціў дуб з корнем і павалок за імі. Выходзіць ён із лесу і, ўвідзіўшы свой дом, свае жыцельство, прыходзіць дамой і крыкнуў на айца і маць: «Ізвольце вам дроў!» — «Ідзі, сынок, ў хату». Ён гаворыць: «Я баюсь! Калі ў лесе хацелі мяне зпотребіць; то ў хаці тым лучше. Пращайце, айцец і маці, брацці і сястра! Жывіце сабе з богам!»

Пашоў ён назад; шоў-шоў, і пападаецца яму наўстрэчу Вернігара. «Здрастуй, брат Пакацігарошак! Куды ідзеш, куды пуць-дарогу дзержыш?» А Пакацігарошак спрашывая ў яго: «Хто ты есць такой?» Ён яму атвечая: «Я есць сільнамагущы багатыр Вернігара». — «Ці хочэш быці маім таварыщам?» — гаворыць Пакацігарошак. А ён: «Можна, хачу табе служыць». І пашлі яны ўмесці. Шлі-шлі, а пападаецца ім наўстрэчу сільнамагущы багатыр Вернідуб. «Здрастуйце, брацці!» — «Здаров!» — «Какіе вы людзі есць?» — спрашывая Вернідуб. «Пакацігарошак і Вернігара». — «Куды ж вы ідзеце?» — «Мы ідзем у такой-то горад. Змей людзей выедая; то ідзем яго біць». — «Ці нельзя мне к вам у таварыщы прыстаць?» — «Можна!» — гаворыць Пакацігарошак.

І прыходзяць яны ў горад являюцца цару. «Какіе вы людзі есць?» — «Мы сільнамагущы багатыры». — «Ці ня можна вам сей горад защыціць? Унадзіўся змей і губіць многа народу; трэба яго пабедзіць!» — «На што ж мы называемся сільнамагущы багатыры, штоб яго ня пабедзілі?» Прыходзіць самая поўнач, і пашлі яны пад каліновы мост, на огненну рэку. Вод прыходзіць шэстіглавы змей і астанавіўся над мастом, і сейчас конь заржаў, сокаў защабетау, а хорт заскімліў. Ён коня ў лоб: «Ты, чортаво стерво, не ржы, а ты, сокаў, не щабечы, а ты, хорт, не скімлі! Бо тут есць Пакацігарошак. Ну, — гаворыць, — выхадзі,

Пакацігарошак! Лібо будзем біцца, лібо мірiцца». Гаворыць Пакацігарошак: «Ні за тым добры маладзец ходзіць, штоб мірiцца, толькі за тым, штоб біцца». І началі яны стражацсь: Пакацігарошак з таварышцами сваімі збілі утраіх змею па галаве. Змей, відзеўшы, што, верно, трэба яму пагінуць, гаворыць: «Ну, браццы, толькі Пакацігарошак мне мешаець, я бы з вамі двумя ўправіўсе!» Вод яны шчэ сталі стражацсь і пабедзілі паследніе голавы, каня змеінага ўзялі ў стайню, сокала ў клетку, а хорта ў псарню; а Пакацігарошак узяў, павырезываў языкі за всех шэсці галов і палажыў сабе ў карман, а тулобіще скацілі ў огненную рэку.

Прыходзяць яны к цару, і Пакацігарошак прыносіць яму языкі для імянной праўды. Цар іх благадарыць: «Віджу, што вы есць сільнамагущы багатыры і защытнікі горада і ўсего народа! Што вам угодна піць і есць, бярыця ўсякіе напіткі і наедкі безденежно і безпошлінно». І з радосці ударіў ён публикацию па ўсему гораду, штоб былі аткрытые ўсе трахтіры, кабакі і малые карчмы для сільнамагущых багатыроў. Вод яны хадзілі паўсюду, пілі, гулялі, прахлаждаліся і разнымі славамі забаўляліся.

Прыходзіць ноч, і ў самую поўнач ідуць яны пад каліновы мост, на огненную рэку, і ўдруг падходзіць сяміглавы змей. Сейчас конь заржаў, сокаў защабетаў, хорт заскімліў. Змей сейчас каня ў лоб: «Ты, чортаво стерво, не ржы, ты, сокаў, не щабечы, а ты, хорт, не скімлі! Бо тут есць Пакацігарошак. Ну, — гаворыць ён, — вылазь, Пакацігарошак! Лібо будзем біцца, лібо мірiцца». — «Ні за тым добры маладзец ходзіць, штобы мірiцца, толькі за тым, штобы біцца!» І началі яны стражацсь, збілі багатыры змею шэсць галоў; сядмая зосталася. Змей гаворыць: «Дай-ка аддыхнем!» А Пакацігарошак гаворыць: «Не дажыдай, каб я табе аддыхаць даў!» Сталі яны апяць стражацсь, збіў ён і паследняю галаву, павырезываў языкі і палажыў ў карман, а тулобіще бросіў ў огненную рэку. Прыходзіць к цару і прыносіць языкі для імянной праўды.

У трэці раз тож паўночно ідуць яны к каліноваму масту і к огненной рэке; ўдруг падходзіць к ім дзевяціглавы змей. Сейчас конь заржаў, сокаў защабетаў, а хорт заскімліў. Змей каня ў лоб: «Ты, чортаво стерво, не ржы, ты, сокаў, не щабечы, а ты, хорт, не скімлі! Бо тут есць Пакацігарошак. А ну, вылазь, Пакацігарошак! Лібо будзем біцца, лібо мірiцца». Пакацігарошак гаворыць: «Ні за тым добры маладзец ходзіць, штобы мірiцца, толькі за тым, штобы біцца!» І сталі яны стражацсь, і збілі багатыры восім галоў, дзевятая зосталася.

Пакацігарошак гаворыць: «Дай-ка аддыхнем, нечыстая сіла!» Яна гаворыць: «Аддыхай — не аддыхай, а са мною не свладзееш; ты і братоў маіх пабедзіў

абманом, не сілаю». Пакацігарошак ні столькі ваюець, как думаець, як бы змея абмануць; адначэ і здумал, і гаворыць: «Да шчэ вашага брата многа есці іззаді — ўсех прыбяру!» Удруг яна аглянулася, а ён і дзевятаю галаву зняў, павырезываў языкі, палажыў сабе ў карман, а тулобіще ў огненную рэку бросіў. Прыходзяць яны к цару. Цар гаворыць: «Благодару вас, сільнамагущы багатыры! Жывице сабе з богом і з радосцю і смеласцю і бярыця, сколькі вам нужна, золота, сярэбра і бумажнай манеты».

После сёго ўсе тры змеіные жаны сашліся ў адно место і ўкладываюць между сабою савет. «Адкудава яны ўзялісь, што нашых мужоў пабілі? Ну, жэнщыны мы не будзем, еслі не звядём іх з свету!» То меньшая гаворыць: «Ну, сястрыцы! Пайдзем мы па бальшой дарозе, куда яны будуць ідці. Я зраблюся прыкраснаю койкаю, і яны, ўтаміўшыся, як сядуць на койке, то ўсем трём будзе смерць!» А другая гаворыць к ёй: «Кады ты ім нічаго не зробіш, то я зраблюся яблынькаю над бальшою дарогаю, і як януць яны ка мне падходзіць — возьме іх прыятны запах, а як папробуюць тых яблак, то ўсем будзе смерць!»

Вот пад’язджаюць багатыры к прыкраснай койке; Пакацігарошак махнуў по ней наўхрест саблею — дак і палілася кроў! Пад’язджаюць яны к яблыньке. «Брат Пакацігарошак, дай-ка з’едім па яблычку», — гавораць багатыры, а ён кажэ: «Кады можна, браццы, так з’едім, а кады неможна, так дальш паедзім». Выймая ён саблю і махнуў яблыньку наўхрест, і палілася ўдруг кроў. Паспешаець за імі трэцяя змея і пусціла сваю пасць ад землі да неба. Відзіць Пакацігарошак, што ім каратко прыходзіцца; как спасцісь? Аглядаецца ён і увидаў, што яна на яго напіраець, і бросіў ёй тры кані ў рот. Паляцела змея да сіня мора ваду піці, а яны ўшлі дальш.

Наганяець яна абратно; відзіць ён, што яна блізко, і бросіў ёй ў рот тры сокалы. Апяць змея до сіняго мора паляцела ваду піць, а яны ўшлі дальш. Аглядываецца Пакацігарошак, змея апяць яго наганяець, і відзіць ён сваю неустойку, ўзяў да бросіў ей тры хорты ў рот.

Апяць яна да сіняго мора паляцела ваду піць; пакудава напілась, яны шчэ дальше ўшлі. Аглядываецца ён і візіць, што апяць яна даганяець; Пакацігарошак, узяўшы абоіх таварыщей, і ўбросіў ў рот. Змея паляцела да сіняго мора ваду піць, а ён дальш. Даганяець яна апяць; ён аглядываецца, відзіць, што недалеко, і гаворыць: «Госпаді, сахрані мяне і спасі маю душу!» І відзіць ён уперед сабе жалезны завод, і ўпадаець у гэту кузніцу. Кузнецы гавораць да яго: «Што, чужостранны чалавек, так абрабеў?» — «Пачтеннейшые гаспада! Сахраніце мяне ад нечыстай сілы і спасіце маю душу». Яны, ўзяўше, кузню заперлі наглухо. «Аддайце маё!» — гаворыць змея.

Вот кузнецы гавораць ёй: «Праліжы жалезны дзверы, а мы яго табе на язык паложым».

Яна пралізала дзверы і язык ў средзіну ўсадзіла. Кузнецы ўзялі ўтраіх гарачымі клещамі за язык і гаворац: «Ступай, чужостранны чалавек! Што хочеш, з нею рабі». Ён выходзіць на двор і давай змею біць, і пабіў на ёй шкуру да касцей, а косці да мазгоў, і ўзяў яну з усем тулобішчом закапаў на сем сажон глубіны. Вод ён і цяпер жывець, да клочче жуёць, а мы хлеб, бо ў яго нет! І я там быў, мед-віно піў; па барадзе цякло, а ў губе ня было.